Аляксей А. Мельнікаў, *З неапублікаванай спадчыны: Манаграфіі, артыкулы, вершы, матэрыялы навуковай канферэнцыі, успаміны сучаснікаў. Мінск* „Чатыры чвэрці" 2005, с . 592.

Рэцэнзуемае выданне прысвечана 1000-годдзю Тураўскай епархіі, якое святкуецца Праваслаўнай Царквой на Беларусі ў 2005 годзе. Як адзначаецца ў „Прадмове" Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Высокапраасвяшчэннейшага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, выхад у свет кнігі А. А. Мельнікава даволі сімвалічны, бо менавіта епіскап Кірыл Тураўскі быў для маладога гісторыка і літаратара „образно говоря, историческим духовным отцом" (с. 6-7). Уладыка Філарэт надзвычай высока ацэньвае рупную працу навукоўца на глебе адраджэння айчыннай духоўнай спадчыны: „Книги белорусского учёного Алексея Мельникова были и остаются одним из наиболее ярких и впечатляющих явлений в сфере национальной научно-исторической литературы рубежа XX-XXI веков, посвящённой Православной Церкви, её историческому пути, незабвенным деятелям и святым подвижникам" (с. 5). Даследчыцкая смеласць і хрысціянскі светапогляд – вось тыя якасці, якія дазволілі А. Мельнікаву стаць знакавай асобай беларускай медыявістыкі. Аляксею Анатолевічу Мельнікаву, таленавітаму даследчыку пісьмовай спадчыны ўсходніх славян эпохі Сярэднявечча і бліскучаму спецыялісту ў галіне тэксталогіі, лёс адмераў няпоўныя 33 гады зямнога жыцця. „З неапублікаванай спадчыны" – гэта сінкрэтычны па сваім змесце мемарыяльны збор твораў, які складаюць манаграфіі, артыкулы і вершы А. Мельнікава.

У змешчаным у кнізе біяграфічным нарысе *Яго зорны шлях* В.А. Чамярыцкі красамоўна называе „песняй песняў" даследчыка „манаграфію на самую ўлюбёную яго тэму – пра жыццё і жыціе Еўфрасінні Полацкай" (с. 9). *Еўфрасіння Полацкая* – гэта спроба рэканструкцыі біяграфіі святой на падставе супастаўлення дадзеных Жыція з іншымі гістарычнымі крыніцамі, калі, па словах самога А. Мельнікава, „паслядоўна адносіцца да Жыція Еўфрасінні Полацкай як да гісторыка-біяграфічнай крыніцы і спрабаваць нават у, здавалася б, тыпова рытарычных або жанрава-парадыгматычных элементах аповесці знайсці зерне рэальных фактаў" (с. 49). Такім чынам вучонаму ўдаецца вызначыць хроснае імя-ракло князёўны Прадславы (у манастве Еўфрасінні) – Еўпраксія (с. 34); удакладніць час нараджэння святой – 5 студзеня 1104 г. (с. 47) і час яе пострыгу ў манахіні – 15 лютага 1116 г. у дзень памяці Еўфрасінні Александрыйскай (с. 48); пераглядзець традыцыйную ў царкоўным ужытку дату скону прападобнай (1173 год) і давесці, што Еўфрасіння спачыла 23-24 мая 1167 г. (с. 99). У сферу навуковай зацікаўленасці даследчыка трапляе царкоўна-літаратурная праца Еўфрасіні Полацкай. А. Мельнікаў не дае веры вуснаму паданню, згодна з якім, прападобная пісала страчаны Полацкі летапіс, разам з тым, у Жыціі святой вучоны знаходзіць фрагменты малітваў і павучанняў, складзеных, а магчыма, і запісаных самой князёўнай (с. 54-55, 74). Асобны раздзел манаграфіі прысвечаны загадкавай асобе каталіцка-уніяцкай, а раней і праваслаўнай святой Параскевы-Пракседзіс, пра якую

паведамляе помнік беларуска-літоўскага летапісання XVI ст. *Хроніка Быхаўца.* На думку А. Мельнікава, у аснову легенды пра Параскеву Полацкую леглі рэальныя факты з жыцця стрыечанай сястры Еўфрасінні Полацкай Еўпраксіі. Пад народным уплывам гэтае імя трансфармавалася ў Параскеву ці Праскоўю. Пры гэтым згадваецца і той факт, што і Еўфрасінню Полацкую прызнае святой таксама і Заходні Касцёл (с. 106-111). Па трапным вызначэнні В. А. Чамярыцкага, „узорным літаратуразнаўчым даследаваннем аднаго помніка агіяграфічнага жанру" (с. 10) названую манаграфію А. Мельнікава робіць наяўнасць у ёй раздзела, прысвечанага вывучэнню літаратурнай гісторыі *Жыція Еўфрасінні Полацкай*, тэксталагічнае даследаванне якога вучоны правёў на матэрыяле амаль сотні (!) спісаў твора. Урэшце, зацікаўленага чытача прыемна здзівіць адкрытая даследчыкам наяўнасць не вельмі аддаленага раства прападобнай Еўфрасінні з Кірылам Тураўскім (с. 33).

Другая манаграфія А. Мельнікава *Жыціе і жыццё свяціцеля Кірыла, епіскапа Тураўскага* атрымала яскравыя жанравыя азначэнні самога аўтара: *„біяграфічная легенда"* пра свяціцеля тураўскага Кірыла (с. 318), „уласная легенда" пра жыццё Тураўляніна (с. 323), „гіпатэтычна-біяграфічны нарыс" пра жыццё святога (с. 380). Відавочна, за гэтым своеасаблівым „самаўніжэннем" хаваецца агромністая карпатлівая навуковая праца медыявіста – даследчыка Сярэднявечча, праца, асаблівасці якой А. Мельнікаў характарызуе так: „...Старажытны тэкст часта перанасычаны, так бы мовіць, *„фактаграфічнымі эўфемізмамі"*, якія мала пазнаць, але за якімі належыць яшчэ і разгледзець рэальную падзею. У гэтых адносінах часам (а дакладней – часта) нават змоўчанне дае больш адэкватную інфармацыю, чым выказванне – нярэдка паводле цэлага шэрагу розных абставінаў непраўдзівае, якое і патрабуе таму не звычайнай, а *двайной інтэрпрэтацыі*, таму што спярша належыць вызначыць, праўдзівае сведчанне або не, а ўжо пасля здагадацца, што хаваецца за ілжывым выказваннем" (с. 318). Паводле праведзенай такім адмысловым спосабам рэканструкцыі А. Мельнікава, Кірыл Тураўскі нарадзіўся ў 1110-1113 гг. і быў яшчэ жывы ў сяр. 1180-х, а то і ў 90-х гг. (с. 332); бацька будучага епіскапа быў начальнікам тураўскага гарнізона або тураўскім намеснікам вялікага князя, а цалкам верагодна, ім мог быць і сам князь Яраслаў (с. 332); пострыг Кірыла, магчыма, быў звязаны са зменай тураўскай княскай дынастыі і ганеннямі на бацькоў святога (с. 333); подзвіг стоўпніцтва быў успрыняты Кірылам у знак супрацьпастаўлення сябе кіеўскім печаранам (с. 350) ці Тураўлянін стаў стылітам у перайманне св. Даніілу Стоўпніку: апошні змагаўся з ерассю монафізітаў, а Кірыл выступаў супраць арыянства (с. 351). На жаль, не ажыццявіліся планы А. Мельнікава па стварэнні працы, прысвечанай Жыцію і жыццю Аўраамія Смаленскага. Тым не менш, дыпціх навукоўца з'яўляецца важкім унёскам у галіне вывучэння старабеларускай агіяграфіі, не ў апошнюю чаргу з тае прычыны, што свой доследАЬ А. Мельнікаў, па ўласным прызнанні, праводзіў пад знакам пытальніка, які найбольш стасуецца з даследаваннем даўніны (с. 310).

На сённяшнім этапе развіцця айчыннай літаратуразнаўчай навукі не губляе сваёй безумоўнай вартасці ўключаная ў выданне, складзеная А. Мельнікавым, праграма курса *Гісторыя беларускай літаратуры*, якая ахоплівае арыгінальную і перкладную, шматмоўную, багатую ў жанравых адносінах літаратуру Беларусі ад Сярэднявечча да Асветніцтва.

Пра шырокае кола навуковых інтарэсаў гісторыка літаратуры сведчаць змешчаныя ў кнізе артыкулы А. Мельнікава „*К вопросу о значении символических фигур в изданиях Ф. Скорины* і *Несколько критических замечаний по поводу «Беларускага праваслаўнага календара» (1994 г.)*.

Душа паэта-хрысціяніна як у люстэрку адбіваецца ў шчымлівай лірыцы кахання А. Мельнікава:

Я запытаў яе. Не адказала,
чаму любоў мая раптам мне стала
крыжам маім, маёй горкаю ношай?
Мне цяжка, Божа... (с. 486)

у па-філасофску заглыбленай нізцы вершаў *Ікар*:

Госпад ішоў супакоеным горадам,
сіняю замеццю, шляхам нябачным:
небам, азораным зорамі, зорамі;
светам, асвечаным плачамі, плачамі.

Позні вандроўнік, вар'ят і паэта,
гнаны ў бяссонне натхнёнаю марай,
убачыў, адзіны, пайшоў за ім следам,
светла ўздыхнуўшы: *Нарэшце, Уладару!* (с. 488).

А. Мельнікаў заўчасна пакінуў гэты свет. Але, па словах Уладыкі Філарэта: „...Его ранний уход в „путь всея земли” наполнил сердца тех, кто знал, любил и глубоко уважал Алексея, решимостью продолжать дело создания современной белорусской агиографии” (с. 7). Сведчаннем гэтаму – апублікаваныя ў кнізе „Матэрыялы навуковай канферэнцыі прысвечанай 40-годдзю з дня нараджэння Аляксея Мельнікава (Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, 14 лістапада 2002 г.)” і ўспаміны сучаснікаў таленавітага самабытнага вучонага.

*Вольга Крычко*
*Кафедра Гісторыі Беларускай Літаратуры Белдзяржуніверсітэта*